

■ Нефармат

# ХТО ВЫРАШАЕ НАВЕРСЕ?

**З унучкай Наталлі Дзмітрыеўны Васінай мы — калегі. Гэта яна расказала мне пра сваю гераічную бабулю. Не, Наталля Дзмітрыеўна не ваявала, не ўздымала цаліну, не скарала Паўночны полюс. Яна жыццё прысвяціла дзецям. Вырасла ў невялікім гарадку на Волзе, адтуль правяла на фронт маладога мужа. Пахавальную атрымала ў самым канцы вайны, калі надзея на хуткае вяртанне асабліва сагравала сэрца. А потым адна ставіла на ногі трох дачок. Дык хіба гэта не гераізм?**

За век яна паспела пабачыць рэвалюцыі, войны, разлады, разрухі, многа добрага таксама. А яшчэ вельмі любіла сваю Волгу. Адзін з самых яркіх успамінаў дзяцінства, як маленькай дзяўчынкай разам з іншымі дзецьмі бегала на ўзбярэжжа паглядзець на вялікі белы параход з гасударам-імператарам на борце. Яны з усіх сіл махалі хусцінкамі з берага, а цар з царыцаю прыязна махнулі ў адказ...

Доўгім і розным было жыццё. А на сотым яго годзе Наталля Дзмітрыеўна пераехала да дачкі ў Бярозаўскі раён. У нейкі момант бабулька адчула сябе дрэнна, неадкладна звярнулася да дактароў. Абследаванне выявіла пухліну кішэчніка. І тады ўсе знаёмыя, калегі родных, у тым ліку маёй знаёмай Марыны, сталі адгаворваць. Навошта, маўляў, падвяргаць аперацыі такога пажылога чалавека? З гэтымі сумненнямі і пайшлі дзеці і ўнукі пажылой жанчыны да доктара. Аўтарытэтны брэсцкі анколаг Канстанцін Шэлепень сказаў ім тады прыкладна так: «А хто нам з вамі даў права вырашаць за Бога? Наша задача — зрабіць усё, што можна, а далей — яго воля». І правёў аперацыю.

Праз нейкі час пасля гэтага ў размове з карэспандэнтам доктар Шэлепень сказаў пра акалічнасць, якая паўплывала на яго рашучасць. Калі зайшоў у палату, убачыў, як Наталля Дзмітрыеўна праз лупу чытала газету. «Калі ў чалавека ў стагадовым узросце такая цікавасць да жыцця — адно гэта выклікае захапленне і павялічвае жаданне дапамагчы», — сказаў Канстанцін Георгіевіч.

Пасля аперацыі Наталля Дзмітрыеўна хутка пайшла на папраўку. Свой стагадовы юбілей яна адзначыла разам з дзецьмі, унукамі, праўнукамі. Пражыла яшчэ два гады. А ўнучка Марына і цяпер успамінае, што яны вельмі доўга адчувалі сябе ніякавата, быццам бы і праўда хацелі вырашыць за Бога. А ў чалавека няма такога права. Ну хіба толькі, калі пагроза хуткай пагібелі прымушае гуляць з лёсам.

Бываюць жа павароты жыцця альбо здарэнні, якія інакш як цудам ці Яго вышэйшай воляй не назавеш. Калі, напрыклад, чалавек сто разоў павінен быў загінуць, а ён застаўся жыць. У тым жа Бярозаўскім раёне расказалі гісторыю выратавання хлопчыка — аднаго з трох тысяч яўрэяў, якіх гналі на смерць ва ўрочышчы Смалярка.

Маці Сямёна Бакштэйна па дарозе да ямы літаральна адкінула малога ў лес, перад гэтым угаварыла сына бегчы як мага далей. І пяцігадовае дзіця паслухалася, а не павісла на руках у матулі, не прыціснулася да яе. Ён пабег, але яго заўважылі, стралялі нават, потым выпусцілі сабак. Ды маленькае, хударлявае нават на свой узрост дзіця нейкім чынам забілася ў лісіную нару, і сабакі згубілі след.

Колькі хлопчык там сядзеў, невядома, але голад яго выгнаў са схованкі. І ўсё роўна малое дзіця ў амаль зімовым лесе было асуджана на пагібель, ды зноў адбыўся цуд — яго заўважылі партызаны і забралі ў атрад. Камандзір атрада Пётр Лебедзеў фактычна выгадаваў Сямёна. Пасля школы гэты сціплы, сарамяжлівы, невялічкага росту чалавек працаваў у сістэме райспажыўсаюза, падвозіў на коніку тавары ў гандлёвыя кропкі. Пажылыя жыхары Бярозы ўспаміналі такі факт, які ў многіх выклікаў здзіўленне. Падчас святкавання Дня Перамогі ці Кастрычніцкіх свят у 50—60-х гадах Сямён заўсёды быў на трыбуне ў шэрагу кіраўнікоў раёна. А справа ў тым, што былы камандзір атрада Лебедзеў стаў потым першым сакратаром райкама партыі ў Бярозе. І хоць хлопец па заўсёднай сваёй сарамлівасці ўпіраўся, партыйны сакратар праяўляў настойлівасць, ён казаў звычайна: «Мы з табой, Сёма, разам ваявалі, разам і пашану прымаць павінны». Так і стаяў Сёма на трыбуне ў выхадным касцюме і паліто, купленых усё тым жа Лебедзевым... Ціха і непрыкметна пражыў у Бярозе Сямён Бакштэйн, сведка трагедыі ў Смалярцы, успамінаў адзін з бярозаўскіх ветэранаў. І паводле ацэнкі апошняга, партыйны інтэлігент Лебедзеў такім чынам аддаваў належнае лёсу, які захаваў дзіця, што прайшло некалькі кругоў пекла, а таксама яго маці, што так адчайна, на мяжы смеласці і вар'яцтва, ратавала маленькага сына.

А колькі кожны з нас, дарагі чытач, здольны ўспомніць пра сябе, родных і знаёмых выпадкаў, калі можна сказаць: «Усё вырашалі імгненні, міліметры, але абышлося. Нібы Бог рукі падставіў, альбо лёс так вырашыў». Але ці ўмеем мы цаніць такія павароты, каб потым нехта не вымаўляў са шкадаваннем: «Сказана ж, не выпрабоўвай лёс тройчы».

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*

■ Акцыя

## Дапамажы аднаўленню: пасадзі свой саджанец!

**Міністэрства лясной гаспадаркі абвяшчае аб правядзенні рэспубліканскай добраахвотнай акцыі «Адновім лясы разам!»**

У ліпені на Беларусь абрынулася нябачанай сілы стыхія. Яе вынікам сталі велізарныя аб'ёмы страт, якія панесла лясная галіна: было пашкоджана 3,2 мільёна кубаметраў драўніны на плошчы амаль 12,8 тысячы гектараў, нагадалі ў прэсслужбе Міністэрства лясной гаспадаркі. Лесаводы краіны дзень і ноч шчыруюць на пашкоджаных участках: бураломныя лесасекі аператыўна расчышчаюцца, драўніна вывозіцца і перапрацоўваецца. На апрацаваных участках ужо пачалася падрыхтоўка глебы пад лесааднаўленне. Таму Мінлясгас звяртаецца да кожнага, хто жадае дапамагчы ў гэтай справе!

Усіх ахвотных запрашаюць 10 верасня прыйсці на пашкоджаны ад наступстваў стыхіі ўчастак лесу і пасадзіць хоць бы адзін саджанец.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

Даты | Падзеі | Людзі

**1 ВЕРАСНЯ**

*Дзень пачатку Другой сусветнай вайны (1939—1945).*

**1762** год — дата нараджэння Яна Рустэма, жывапісца і малявальшчыка, педагога. Творчасць звязана з мастацкім жыццём Беларусі і Літвы. У 1798—1832 гадах выкладаў у Віленскім універсітэце (з 1811 года — прафесар). Рэарганізаваў сістэму навучання ў Віленскай мастацкай школе, што садзейнічала развіццю рэалістычнага мастацтва ў XIX стагоддзе. Аўтар шматлікіх партрэтаў, жанравых сцэн у духу ранняга рамантызму («Бабуля і ўнучка»), малюнкаў з гарадскога і сельскага жыцця. Творы захоўваюцца ў музеях Літвы, Польшчы, Германіі. Памёр у 1835 годзе.

**1936** год — нарадзіўся Валерый Лягасаў, хімік-неарганік, спецыяліст у галіне энергатэхналогій ядзерных рэактараў. Акадэмік АН СССР. Лаўрэат Ленінскай прэміі і Дзяржаўнай прэміі СССР. 27 красавіка 1988 года, у другую гадавіну аварыі на ЧАЭС, Лягасаў быў знойдзены ў сябе ў кабінеце павешаным. Перад смерцю ён зрабіў запіс на дыктафон пра малавядомыя факты, што тычацца катастрофы (па некаторых звестках, частка паслання была затым наўмысна сцёртая). У 1996 годзе прэзідэнт Расіі Барыс Ельцын падпісаў указ аб пасмяротным прысвяенні В. Лягасаву звання Героя Расіі за «адвагу і гераізм, праяўленыя падчас ліквідацыі чарнобыльскай аварыі».

**1936** год — нарадзіўся (вёска Дзешчанка, цяпер Узвенскі раён) Уладзімір Тарасік, беларускі вучоны ў галіне праектавання аўтамабільнага транспарту, доктар тэхнічных навук, прафесар, заслужаны вынаходнік. Аўтар навуковых работ па тэорыі руху аўтамабіля, праектаванню гідрамеханічных перадач. Адзін з распрацоўшчыкаў вялікагрузнага аўтасамазвала БелАЗ-540.

**1969** год — дзень нараджэння беларускага ансамбля «Песняры». Яго гісторыя пачалася ў 1965 годзе, калі вайсковая служба ў Чырванасцяжнай Беларускай ваеннай акрузе звяла чатырох музыкаў — Уладзіміра Мулявіна, Леаніда Тышко, Уладзіслава Місевіча і Валерыя Яшкіна. Але днём нараджэння калектыву лічыцца 1 верасня 1969 года, калі рашэннем мастацкага савета Мінскай філармоніі група «Лявоны» (першапачатковая назва калектыву) атрымала права называцца вакальна-інструментальным ансамблем. Ён спачатку пазіцыянаваўся як фальклорны. Аснову рэпертуару складалі апрацаваныя беларускія народныя песні. У традыцыйны гітарна-ўдарны склад былі ўведзеныя жалейка, цымбалы, ліра, скрыпка. Смела распрацоўваючы фальклорныя элемент, ансамбль паказаў сябе наватарам жанру, узначаліўшы цэлы кірунак, які быў названы «фальклорны біт». Мастацкім кіраўніком ансамбля з моманту яго ўтварэння і да сваёй смерці ў 2003 годзе быў Уладзімір Мулявін.



Было сказана

**Георгій МАРЧУК, пісьменнік:**
*«Мозг — універсальны млын. Ён усё змеле».*

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.18 | 19.59 | 13.41 |
| Віцебск — | 6.05 | 19.51 | 13.46 |
| Магілёў — | 6.08 | 19.50 | 13.42 |
| Гомель — | 6.08 | 19.44 | 13.36 |
| Гродна — | 6.34 | 20.14 | 13.40 |
| Брэст — | 6.37 | 20.12 | 13.35 |

## Месяц

*Маладзік. Месяц у сузор'і Дзевы.*

## Імяніны

*Пр. Фёклы, Андрэя, Мікалая, Цімафея. К. Бранiславы.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




## ...у суседзяў

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА +21..+23°С | КІЕЎ +24..+26°С | РЫГА +18..+20°С |
| ВІЛЬНЮС +19..+20°С | МАСКВА +20..+22°С | С.-ПЕЦЯРБУРГ +16..+18°С |

## УСМІХНЕМСЯ

**— Вы трымаеце дома якіх-небудзь жывёл?**

**— Трымаем. Сабаку, кошку і марожаную скумбрыю!**

— Чаму ў вас посуд разбіты?

— Сварыліся.

— А канапа чаму разламаная?

— Мірыліся...

**Трэба забараніць рэкламу дэзадарантаў «72 гадзіны аховы»: ёсць людзі, якія ёй вераць, і яны ездзяць потым у метро!**

Я зразумела, што час заканчваць з дыетай, калі рэакцыя на насякомае, якое выбягала з салаты, стала не «Фу-у, што за гадасць?!», а «Куды?!»

**Лепшае заканчэнне спрэчкі з жанчынай — прыкінуцца мёртвым.**




Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 3556.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 31 жніўня 2016 года.